**АХОВА І ТРАНСЛЯЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ЯК ШЛЯХ ДА ЭТНАЭКАЛАГІЧНАЙ РАЎНАВАГІ Ў СВЕЦЕ**

ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА!

Дарагія ўдзельнікі канферэнцыі, замежныя госці, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, магістранты і аспіранты ўніверсітэта, калегі з іншых навучальных устаноў і навуковых цэнтраў, удзельнікі фальклорных калектываў і аб’яднанняў! Мне вельмі прыемна звярнуцца да вас з урачыстай нагоды адкрыцця IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі)», якая адбываецца наканадні 40-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў – у шмат чым знакавым і вельмі сімвалічна насычаным для нашай установы вышэйшай адукацыі годзе!

Варта адзначыць, што канферэнцыя, канцэптуальна прысвечаная аўтэнтычнаму фальклору, безумоўна, магла з’явіцца толькі ў нашым універсітэце, які ад стварэння быў буйным *цэнтрам тэорыі народнай культуры* і сапраўдным *крэатарам практычнай фальклрыстыкі* Беларусі. Працы нашых супрацоўнікаў *Міколы Грынчыка, Івана Цішчанкі* – агульнапрызнаны буйны і плённы ўнёсак у філалагічна арыентаваную фалькларыстыку. У славянскім свеце добра вядомыя працы беларуска-польскага этнамузыколага і мовазнаўцы *Галіны Кутыровай-Чубалі*, якая пачынала свой педагагічны і даследчы шлях у сценах універсітэта. У саветах па абароне дысертацый нашай установы плённа працавалі такія выбітныя даследчыкі традыцыйнай культуры, як філосаф і эстэтык *Уладзімір Конан*, этнамузыколаг і аўдыёвізуальны антраполаг *Зінаіда Мажэйка*. Яны далі «шлях у жыццё» дзясяткам маладых навукоўцаў, якія сёння сваімі даследаваннямі фальклору працягваюць выконваць ва ўніверсітэце навуковы тэстамент гэтых міжнародна вядомых «сталпоў» беларусазнаўства. Самыя значныя прадстаўнікі практычнай фалькларыстыкі Беларусі мяжы ХХ-ХХІ стагоддзяў – *Станіслаў Дробыш, Уладзімір Гром, Мікалай Дудчанка* – таксама вельмі працяглы час былі прафесарамі нашай установы. Мы заслужана ганарымся сённяшнімі сваімі супрацоўнікамі-беларусазнаўцамі: даследчыкам народнага дэкаратыўна-выяўленчага мастацтва *Рыгорам Шаурам*, спецыялістам па народным тэкстылі *Вольгай Лабачэўскай*, даследыкам музычна-інструментальнага фальклору *Наталляй Яканюк*, спецыялістам па народным тэатры *Пятром Гудам*, даследчыкам народнага танца *Юліяй Чурко*, лаўрэатамі спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва за фундаментальны шматтомны фальклорны збор «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» этнахарэолагам *Міколам Козенкам*, філолагам *Аленай Боганевай* і этнамузыколагам *Тамарай Варфаламеевай*. Шмат чаму могуць навучыцца студэнты, якія цікавяцца фальклорам, ад гісторыка фалькларыстыкі *Аляксандра Марозава*, філолага і семіётыка *Аляксея Рагулі*, культуролага і тэарэтыка фальклору *Энгельса Дарашэвіча* і іншых прызнаных спецыялістаў па народнай творчасці, працуючых ва ўніверсітэце.

Універсітэт культуры і мастацтваў заўсёды аператыўна рэагаваў на патрэбы грамадства ў галіне народнай культуры. Калі ў міленіум навукоўцы канстатавалі небяспеку вынішчэння фальклору, наша ўстанова, пры спрыянні з боку органаў дзяржаўнага кіравання, адкрыла факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, шэраг спецыяльнацей і спецыялізацый, якія накіраваны на захаванне такіх праяў каранёвай культуры беларусаў, як аўтэнтычныя спевы, дударская музыка, народныя промыслы і рамёствы, фальклорны тэатр. Сёння нашыя выпускнікі, якія атрымалі этнамастацкую адукацыю, атрымліваюць узнагароды на мастацкіх фестывалях (як выканаўцы) і прызы ў конкурсах работ маладых навукоўцаў (як даследчыкі). Яны стажыруюцца і працягваюць адукацыю ў замежных універсітэтах, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, тым самым сапраўды з’яўляючыся дастойнымі пераемнікамі справы жыцця сваіх паважаных выкладчыкаў-беларусістаў.

ХХІ стагоддзе – стагоддзе ўціску глабалізацыі, стагоддзе небяспечных міжканфесійных і міжэтнічных канфліктаў – ставіць перад антрапалагічнымі навукамі надзвычай актуальныя *задачы*: задачу *практычнага захавання і дзейснай трансляцыі паміж пакаленнямі скарбаў каранёвых культур* усіх народаў; задачу *практычнага выкарыстання этнаэкалагічнага патэнцыялу кожнай традыцыйнай культуры*. І гэта не дзіўна: носьбіты традыцыйнай культуры, як правіла, здольныя прыгожа і дастойна пражыць сваё жыццё ў міры і згодзе і з сабою, і са сваімі суседзямі, і з прыродным і сацыяльным наваколлем… Гэты вопыт сёння нельга забыць ці ігнараваць. Яго неабходна адаптаваць да сучаснасці і трансліраваць праз час і прастору, інакш чалавецтву не выжыць.

Я жадаю вам прадуктыўнай працы, новых адкрыццяў у *этналогіі, філалогіі, аўдыёвізуальнай антрапалогіі, мастацтвазнаўстве, культуралогіі* – ва ўсіх галінах навукі, якія прысвечаны народазнаўству. Я шчыра жадаю плёну ўсім беларускім удзельнікам канферэнцыі, нашым гасцям з суседніх сяброўскіх краін, фальклорным калектывам, якія завіталі да нас і бяруць удзел як у навуковай рабоце, так і ў творчай, мастацкай праграме канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор», якая ў наступным 2016 годзе будзе ўжо дзясятай, юбілейнай.

Прафесар, рэктар
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Юрый Бондар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ